УДК 629. 735

# Беларуская дыяспара у Расіі

Лойка Т.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Беларуска - рускія ўзаемапранікненні адыходзяць сваімі каранямі ў далёкае сярэднявечча. Перасяленні беларусаў на ўсход дыктаваліся рознымі прычынамі: гэта і дынастычныя шлюбы і сваркі, націск каталіцтва, войны, якія ішлі з захаду, сталінскія рэпрэсіі, камуністычныя новабудоўлі і інш. Многія з перасяленцаў хутка засвойвалі рускую мову, зліваліся з мясцовым насельніцтвам і паступова асіміляваліся. І тым не менш у канцы 90-х гадоў XX ст. беларусамі называлі сябе больш за 800 тыс. чалавек. Гэта пятая па колькасці дыяспара на тэрыторыі Расіі. Беларуская прысутнасць у розныя часы выяўлялася шэрагам вядомых імёнаў, такіх як М.Глінка і Ф.Дастаеўскі, П.Клімук і У.Кавалёнак, А.Вольскі і А.Чубайс і інш.

Зараз беларуская дыяспара мае досыць разгалінаваную структуру ў 34 суб'ектах Расійскай Федэрацыі. Найбольш буйныя з іх - Федэральная нацыяна-культурная аўтаномія (ФНКА) "Беларусы Расіі", якая аб'ядноўвае больш за 50 грамадскіх арганізацый, Міжрэгіяльнае аб'яднанне беларусаў Расіі, Маскоўскі клуб беларусаў і 47 падобных клубаў у розных гарадах Расіі. Некаторыя з іх маюць свае друкаваныя выданні, як маскоўская газета "Сябры", пецярбургская "Родзічы", краснаярская "Калі ласка". Галоўнымі мэтамі іх дзейнасці з'яўляюцца захаванне тоеснасці беларускай нацыі, развіццё беларускай мовы і культуры, прапаганда беларускай гісторыі. Праводзяцца розныя культурныя мерапрыемствы., фестывалі, конкурсы, выставы, ладзяцца сустрэчы з вядомымі беларусамі, працуюць краязнаўчыя гурткі.. На сродкі беларусаў у Калінінградзе ўзведзены помнік Ф.Скарыне, у Новасібірску пабудаваны храм Ефрасінні Полацкай. Пры Маскоўскім клубе адкрыты гандлёвы дом, заснаваны юрыдычны цэнтр. Пры удзеле актывістаў Маскоўскага клуба ў 2002 годзе ў Маскве адкрыты філіял Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Значную дапамогу ў арганізацыі работы суполак аказвае беларускае пасольства ў Маскве, якое наладзіла выпуск інфармацыйнага выдання "Беларусы Расіі".

Самаадчуванне беларусаў у Расіі складваецца на аснове сяброўскіх адносін з тытульнай нацыяй, імкнення прыстасавацца да тамтэйшых рынкавых адносін і заставацца карыснымі для сваёй Радзімы. Прадстаўнікі дыяспары аказваюць усялякае садзейнічанне прасоўванню беларускай прадукцыі на расійскі рынак, усталяванню дзелавых кантактаў, арганізацыі сумесных культурных акцый.